# КАНСТЫТУЦЫЙНЫЯ АСНОВЫ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ: ГІСТАРЫЧНЫЯ ПАРАЛЕЛІ

***Г.В. Дзербіна,*** *кандыдат юрыдычных навук, дацэнт, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь*

У сучасным стаўленні да праблемы канстытуцыяналізму вылучаецца важная роля палітыка-прававой традыцыі ў гісторыі станаўлення дзяржаўнасці [1, с. 109-116]. XVI ст. у гісторыі дзяржаўнасці нашай краіны, як часткі Вялікага Княства Літоўскага (далей ВКЛ), вызначаецца найбольш выразным адлюстраваннем канстытуцыйных асноў у заканадаўстве.

Паступовае фарміраванне асноў канстытуцыяналізму XVI ст. грунтуецца на агульназемскіх прывілеях ВКЛ 1387, 1413, 1432, 1447, 1492, 1506, 1563, 1564, 1565 гг., пад уздзеяннем акта Люблінскай Уніі 1569 г., Генрыкавых артыкулаў 1573/1576 гг., акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. і інш. дакументаў. Статуты Вялікага Княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг., як помнікі рэнесансавай прававой культуры, зацвердзілі асноўныя рысы развіцця асноў канстытуцыяналізму.

Канстытуцыйныя асновы дзяржаўнасці, зацверджаныя Статутам 1588 г. і іншымі актамі, з’явіліcь замацаваннем перамогі шляхецкага руху і асновай шляхецкай дэмакратыі ў змаганні з магнацкай алігархіяй на пэўны перыяд. Як адзначаюць даследчыкі “… паслялюблінскае 50-годдзе можна лічыць часовай перамогай шляхецкага павета над арыстакратычным цэнтрам. Магнацкае грамадска-палітычнае вяршынства ў гэты час відавочна пахіснулася і падзялілася з даволі шырокім прадстаўніцтвам сярэднепаместнай шляхты. Неабходна была пераарыентацыя магнатэрыі на павятовы зрэз, каб захапіць кантроль над шляхецкімі ўладнымі структурамі” [2, с. 97].

Развіццё інстытутаў шляхецкай дэмакратыі, фарміраванне цэнтральнай і дасканалай мясцовай сістэм прадстаўнічых інстытутаў з’явіліcь асноўнымі палітыка-прававымі працэсамі XVI ст., якія адначасова былі адлюстравннем усталявання шляхецкай дэмакратыі і ўплывовым фактарам развіцця правоў усіх саслоўяў.

Адным з асноўных кірункаў фарміравання канстытуцыяналізму з'яўлялася абмежаванне ўлады манарха. Перадумовы фарміравання прадстаўнічых органаў складаліся з праўлення вялікага князя Казіміра, пры ім паступова вызначылася рада паноў як прадстаўнічы орган уплывовых феадалаў, што зацверджана прывілеем 1447 г., пазней 1492 г. Цалкам сістэма прадстаўнічых інстытутаў, пашырэнне кампетэнцыі сейма, абмежаванне ўлады манарха склалася ў выніку сістэмнай рэформы, стварэння павятовага узроўню прадстаўнічых органаў на падставе Бельскага прывілея 1564 г., Віленскага прывілея 1565 г., “Генрыкавых артыкулаў” 1573 г.

Тэндэнцыя абмежавання ўлады манарха найбольш відавочна адлюстравалась у Генрыкавых артыкулах 1573 г. Суверэнітэт манарха (караля і вялікага князя) быў абмежаваны сеймам і радай: зацверджаны вольныя выбары манарха і адмова манарха ад спадчыннасці трона, абавязак манарха праводзіць знешнюю і ўнутраную палітыку і абарону дзяржавы на падставе згоды з усімі станамі сейма. Артыкулы пацвярджалі рэгулярную дзейнасць прадстаўнічых органаў: вальнага сейма, галоўнага і павятовага сеймікаў. Важным правам на захаванне суверэнітэту ВКЛ зацвярджалася права на ўласнае заканадаўства праз пацвярджэнне асабіста манархам. З асабістых неад’емных правоў былі зацверджаны правы шляхты на зямельную маёмасць, інш. Генрыкавы Артыкулы гарантавалі права шляхты на адмову ў падпарадкаванні манарху пры парушэнні ім сваіх абавязацельстваў. Асноўныя палажэнні Артыкулаў увайшлі ў Статут 1588 г.

Кампрамісны характар Люблінскай Уніі 1569 г., аб’яднаўшы ВКЛ і Карону Польскую ў адну федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую, быў фактычна перагледжаны з боку ВКЛ у часы першых двух бескаралеўяў 07.1572- 06 1576. Часы бескаралеўя вымусілі ўдасканаліць заканадаўчую аснову прадстаўнічых інстытутаў: фарміруюцца працэдуры канвакацыйных, элекцыйных і каранацыйных сеймаў, адбываецца зацвярджэнне Галоўнага сейміка Княства, удасканальваецца і пашыраецца сістэма павятовых сеймікаў ВКЛ праз арганізацыю дэпутацкага (1582) і рэляцыйнага сеймікаў (1588), якія здзяйсняюць пэўны кантроль за

дзейнасцю вышэйшай ўлады, найперш вальнага сейма. Сістэма павятовых сеймікаў забяспечыла рэалізацыю права станаў шляхты на самакіраванне і незалежнасць шляхецкіх судоў. Узніклі моцныя інстытуты шляхецкай дэмакратыі.

Ідэя гарантыі дзяржаўнай незалежнасці ВКЛ праз заканадаўства становіцца асновай кадыфікацыі права. Палітыка незалежнасці ВКЛ у складзе РП рэалізавалася і праз практыку удзелу ў падрыхтоўкі законаў Галоўнага сейміка ВКЛ, павятовых сеймікаў, а з 1580х гг. усталявалася практыка прыняцця асобных сеймавых канстытуцый для ВКЛ. З 1576 г. быў створаны Галоўны з'езд ВКЛ, які не быў зацверджаны заканадаўча, але практычна здзяйсняў кампетэнцыю вальнага сейма. Палітыка партыкулярызму, незалежнасці ВКЛ у складзе РП рэалізуецца праз практыку асобнай распрацоўкі і зацвярджэння заканадаўства для ВКЛ санкцыяй манарха, без удзелу вальнага сейма. Падобная практыка спрыяла зацвярджэнню Статута 1588 г. санкцыяй манарха Жыгімонта III без удзелу вальнага сейма РП, умацаваўшы палітычную незалежнасць ВКЛ.

Такім чынам, у канцы XVI ст. сістэма прадстаўнічых інстытутаў набыла разгалінаваны характар, складалася з двух узроўняў: павятовага і сеймавага, рэалізуючы правы шляхты на кіраванне дзяржавай найбольш за ўсю гісторыю ВКЛ.

Канцэпцыя Статута 1588 г. была каротка выкладзена падканцлерам Л. Сапегам у прадмовах-зваротах да Статуту 1588 г., у якіх адлюстраваліся канстытуцыйныя асновы дзяржаўнасці: прызнанне прыроджаных і неад'емных правоў чалавека на жыццё, годнасць, свабоду і маёмасць, вольнасць асобы як найважнейшая каштоўнасць, вяршынства закону як аснова стабільнасці дзяржавы, роўнасць ўсіх перад законам [3, с. 47, 42-48].

Статут ВКЛ 1588 г. адлюстраваў каштоўнасці грамадства, у якім павінны панаваць агульная згода, справядлівасць і вольнасць на падставе закону, захаванне неад'емных правоў чалавека, дэмакратычнасць шляхецкіх інстытутаў, развіццё парламентарызму, захаванне суверэнітэту ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай.

### *Список литературы*

1. Арановский, К.В. Государственное право зарубежных стран: учебное пособие / К.В. Арановский. - М.:«ФОРУМ»-«ИНФРА-М», 1999. – 488 с.
2. Лойка, П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. / П.А.Лойка. – Мінск: БДУ, 2002. – 99 с.
3. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588: Тэксты, Давед. Камент. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.